# РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ПАЯСОЎ ЯК ФЕНОМЕНА КУЛЬТУРЫ

*Н.А.Лісоўская,*
аспірант Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў

Пояс з'яўляецца неабходным атрыбутам нацыянальнага касцюма і нясе багаты сімвалічны і міфалагічны змест. У традыцыйнай беларускай культуры пояс разумеўся як утылітарны і адначасова знакава-рытуальны прадмет, глыбінная сімволіка якога была цесна звязана са старажытнымі рэлігійна-міфалагічнымі ўяўленнямі [2]. Вялікай роляй, якую ігралі паясы ў народным быце, тлумачацца іх шырокі выраб і багатае мастацкае афармленне. Немагчыма ўявіць ніводнай выставы, прысвечанай жыццю, побыту народа і адзенню, без паясоў як феномена традыцыйнай культуры. У музейнай калекцыі паясы ўяўляюць сабой рэчы, якія з'яўляюцца абавязковым кампанентам народнага строю і рытуальнай дзейнасці, утрымліваюць інфармацыю аб бытавым укладзе, эстэтычных і рэлігійных паданнях. Рэвіталізацыя мае на ўвазе аднаўленне здольнасці аб'екта да функцыянавання і самаўзнаўлення, таму для рэвіталізацыі паясоў як феномена культуры неабходна аднавіць традыцыі стварэння і нашэння паясоў.

Вывучэннем паясоў як віду народнай творчасці, а таксама іх гістарычнай значнасці пачалі займацца ў сярэдзіне 80-х гг. мастацтвазнаўцы Навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі (НДМЭЛ) В. Селівончык і О. Лабачэўская. Была праведзена карпатлівая пошукавая, апісальная і практычная работа, якая дала бясспрэчныя вынікі. Аддзелам ткацтва НДМЭЛ былі паўтораны традыцыйныя ўзоры, адноўлены тэхнікі пляцення. З цягам часу НДМЭЛ было пераўтворана ў прадпрыемства «Скарбніца» [5], якое на сёння з'яўляецца адным з галоўных прамысловых прадпрыемстваў, якое займаецца адраджэннем традыцый ткацтва і вырабам адзення па ўзорах народнага строю. Сцэнічныя касцюмы, выраблены майстрамі «Скарбніцы», можна ўбачыць амаль на ўсіх дзяржаўных канцэртных і тэатральных пляцоўках. Вырабы гэтага прадпрыемства карыстаюцца поспехам у танцавальных, харавых і тэатральных калектывах, напрыклад, у дзяржаўным калектыве «Харошкі», а таксама як падарункі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Добры прыклад уключэння нацыянальнай спадчыны, народнага адзення, а разам з тым і паясоў у сучасную мастацкую культуру даюць самадзейныя этнаграфічныя калектывы шэрагу вёсак Беларусі (у Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці, заходніх раёнах Гомельскай і Мінскай абласцей). Створаныя імі касцюмы вызначаюцца не толькі высокім выканаўчым майстэрствам, але і арганічным адзінствам рэпертуару і вобразаў выканаўцаў. У творчасці і касцюмах народных этнаграфічных калектываў бачны беражлівае захаванне і працяг багатых народных традыцый. Менавіта яны ў параўнальна дакладным выглядзе даносяць да нас прыгажосць і асэнсаванасць народнага адзення.

Уключэнне лепшых традыцый народнай творчасці ў сучаснае аддзенне з’яўляецца актуальнай і разам з тым складанай задачай сучаснасці. Яна асноўваецца на неабходнасці захавання культурных каштоўнасцей.

Формы выкарыстання лепшых традыцый народнай творчасці ў сучасным адзенні разнастайныя. Гэта выкарыстанне розных традыцыйных матэрыялаў, прынцыпаў іх спалучэнняў, прыёмаў камплектацыі састаўных частак адзення, народных спосабаў і прыёмаў арнаментацыі, самога арнаменту і інш. Найбольш шырока традыцыі народнага строю выкарыстоўваюцца ў сучасным сцэнічным касцюме. У ім у роўнай меры прадстаўлена ўся разнастайнасць кампанентаў традыцыйнага народнага адзення, ад галаўных убораў да паясоў. Спецыфічнасць прызначэння сцэнічнага касцюма як відовішчнага патрабуе максімальнага набліжэння яго да народных форм. Асабліва гэта неабходна ў тэатральным касцюме, які павінен поўнасцю адпавядаць народнаму, часам з вылучэннем этнаграфічных асаблівасцей, напрыклад тэрытарыяльных. У касцюмах для харавых і танцавальных калектываў дадзенае патрабаванне менш жорсткае. Гэта звязана з сучаснай інтэрпрэтацыяй рэпертуару, калі ў народных танцах захоўваюцца толькі асноўныя характэрныя нацыянальныя рысы [1].

Паколькі сцэнічны касцюм становіцца здабыткам шырокіх мас гледачоў, ён з’яўляецца своеасаблівым папулярызатарам традыцыйнага пояса, адраджае народнае аддзенне, такім чынам, актуалізуе культурную спадчыну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Майстар-клас «Паясы ў вясельнай традыцыі.
Пляценне паясоў» у рамках выставы «Пасаг»

Адраджэнню народных рамёстваў спрыяе дзейнасць музеяў, накіраваная на выяўленне і развіццё творчых здольнасцей асобы. У апошні час у музеях арганізуюць такія формы культурна-адукацыйнай дзейнасці, як гурткі, студыі, клубы. У рабоце гурткоў пазнавальныя элементы спалучаюцца з творчымі. Так, у музеі археалогіі ў Варшаве мы сталі сведкамі правядзення аднаго з заняткаў гуртка «Народнае ткацтва». Дзякуючы такім заняткам дзеці маюць магчымасць не толькі знаёміцца з традыцыйнай тэхнікай ткацтва паясоў, але і набыць уласны вопыт, а выраблены пояс захаваць як узор самастойнай працы.

Таксама прыкладам такой дзейнасці з'яўляецца Санкт-Пецярбургскі клуб ручнога ткацтва «Параскева», які працуе на базе Расійскага этнаграфічнага музея (РЭМ). Практычная дзейнасць клуба мае тры асноўныя кірункі: 1) капіраванне этнаграфічных узораў; 2) праца ў рамеснай традыцыі з выкарыстаннем сучаных матэрыялаў; 3) распрацоўка канцэптуальных мадэляў выставачных узораў ткацтва як вопыт трансфармацыі традыцый. Гэтыя аспекты дзейнасці рэалізуюцца ў наступных блоках: школа ткацтва (дарослыя і дзеці), майстэрні і непасрэдна сам клуб [4].

На базе РЭМ існуе дзіцяча-юнацкі этнаграфічны цэнтр «Школа рамёстваў», дзе запрошаныя майстры навучаюць удзельнікаў традыцыйным і сучасным рамёствам, у тым ліку ткацтву паясоў.

Адным з кірункаў рэвіталізацыі народных рамёстваў з'яўляецца дзейнасць, накіраваная на правядзенне выстаў і майстар-класаў. Добрым прыкладам у гэтым з'яўляецца дзейнасць прадпрыемства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Скарбніца». Так, у рамках выставы «Вясна-красна», якая адбывалася ў галерэі Універсітэта культуры і мастацтваў у 2007 г., і выставы «Пасаг» (гл. на стар. 296 мал.) у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ў 2008 г., праводзіліся майстар-класы розных традыцыйных і сучасных рамёстваў: вышыванне, пляценне паясоў і г.д. Таксама прадпрыемства рэгулярна праводзіць выставы ўласных твораў, паказы сучаснага адзення, распрацаванага ў лепшых традыцыях народнага строю.

Музейныя святы, у якіх адной тэмай аб’яднаны элементы экскурсіі і тэатралізаваных прадстаўленняў, спрыяюць рэвіталізацыі культурнай спадчыны і разам з тым адказваюць запатрабаванню людзей у рэкрэацыі. Аднымі з яскравых прыкладаў такой формы дзейнасці служаць фальклорныя святы ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту [3]. Яны праводзяцца музейнымі спецыялістамі на падставе дасканала распрацаванага сцэнарыя пры ўдзеле творчых супрацоўнікаў тэатраў, музычных устаноў, мастацкай самадзейнасці. На кірмашах, абавязковых кампанентах свят, можна пабачыць і набыць творы сучасных майстроў, выраблены ў аўтэнтычных традыцыях. Арганізатары і ўдзельнікі прадстаўленняў выступаюць у народным адзенні. У праграму мерапрыемстваў звычайна ўваходзіць і правядзенне майстар-класаў. Так у 2008 г. на свяце «Гуканне вясны» быў праведзены майстар-клас, прысвечаны традыцыйным тэхнікам ткацтва паясоў. Жадаючыя маглі ўявіць сябе на месцы сялян і паспрабаваць вырабляць паясы. Зыходзячы з гэтага, можна гаварыць аб тым, што фальклорныя святы на сёння з’яўляюцца аднымі з галоўных шляхоў адраджэння традыцый вырабу і нашэння народнага адзення, а значыць, і паясоў.

У поле зроку сучаснага рацыянальнага чалавека трапляюць праблемы, якія звязаны з фарміраваннем прадметнага свету, а значыць, і ткацтва як аднаго з працэсаў. А таму рэвіталізацыя гэтай культурнай спадчыны становіцца запатрабаванай. Правядзенне шматлікіх фальклорных свят, майстар-класаў, стварэнне адзення і аксэсуараў сучаснымі мастакамі і дызайнерамі на аснове традыцыйных ансамбляў з’яўляюцца яркімі прыкладамі ўключэння спадчыны ў штодзённасць. У сучаснай матэрыяльнай культуры беларускага народа працягваюць жыць і развівацца лепшыя народныя традыцыі, якія вытрымалі выпрабаванне часам, захавалі сваю нацыянальную форму і ўзбагаціліся новым зместам. Міфалагічны сэнс пояса знік амаль незваротна, але ўтылітарнае прызначэнне і дэкаратыўную функцыю ён не страціць ніколі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Адзенне* сельскага насельніцтва савецкай Беларусі [Электрон. рэсурс] // Партал беларускага фальклору. – Мінск, 2004. – Рэжым доступу: http://falklor.at.tut.by/adzenne /10_sialo.htm. – Дата доступу: 17.11.2011.

*2. Байбурин, А. К.* Семиотический статус вещей и мифология / А. К. Байбурин. – Материальная культура и мифология: сборник Музея антропологии и этнографии. – СПб., 1981. – С. 226.

*3. Беларускі* дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту // [Электрон. рэсурс]. – Рэжым доступу: http://etna.by/. –Дата доступу: 26.02. 2012.

*4. Лысенко, О. В.* Ткань, ритуал, человек – традиции ткачества славян Восточной Европы / О. В. Лысенко, С. В. Комарова. – СПб.: Астур, 1992. – 24 с.

*5. Скарбница* – народные промыслы Беларуси [Электрон. ресурс] // УП «Скарбница». – Режим доступа: http://skarbnica. by/. – Дата доступа: 25.01.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ